## № 101. Ганьне, Элеаноры і Алесі Бабарэкам

*26 сакавіка 1935 г.*

Дарагія і любыя Анечка, Лорачка і Лялячка!

Гэтымі днямі атрымаў Антось лістоўку ад сваіх бацькоў. Пішуць, што Янка прыехаў у Менск, але дзівак ня ўзяў на месцы пашпарта і таму, пабыўшы дома адзін дзень, мусіў выехаць у Бабруйск, каб там узяць пашпарт. У Менску не выдаюць. Бяз пашпарта не бяруць нідзе на работу, а без работы не даюць пашпарта. От так і апынуўся як белка ў калясе. Ніна казала, што як ня ўдасца атрымаць у Бабруйску, дык давядзецца хоць назад ехаць, па пашпарт. А там яму давалі трохгадовы, дык не дачакаўся, а пасьпяшаўся да сям'і.

Меў я яшчэ лістоўку ад Уладзіка. Працуе на тым самым месцы. Марыля працуе пэдолёгам. Альгерд ходзіць у дзіцячы сад.

Учора купіў я чатыры мэтры спэцыяльнага палатна на ручнікі. Чакаю Вашага прыезду. Цалую Вас моцна.

*Адам.*

## № 102. Ганьне, Элеаноры і Алесі Бабарэкам

*2 красавіка 1935 г.*

Дарагія і любыя Анечка, Лорачка і Лялячка!

Янку далі пашпарт у Бабруйску толькі на 3 м[еся]цы. Наконт пэдагогічнай работы быў ён у наркамасьветы, і той яму адказаў, што „ня выходзіць“ з работай на Беларусі. Зварочваўся ён тады ў іншыя ўстановы: у лесбеле дакляравалі, быццам, паслаць яго некуды на працу. Па дарозе дадому спыняўся ў Маскве, заходзіў у наркамасьветы пытацца пэдагогічнай працы, яму паказалі сьпіс вакансій у пэдагогічных інстытутах як поўдня, так і поўначы і прапанавалі месца з новага навучальнага году на выбар. Цяпер мяркуе вярнуцца назад па трохгадовы пашпарт.

Трэба хіба й сабе падаць запрос наконт працы ў пэдагогічным інстытуце, ды калі прыдзе станоўчы адказ — і брацца за падрыхтоўку. Ёсьць месцы ў такіх гарадох, як Сэмфіропаль, Наварасійск. Як ты глядзіш на такую пэрспэктыву на наступную зіму? Ня дрэнна было–б атрымаць назначэньне куды–небудзь на поўдзень і каб было яно з кватэрай ды з пераездам.

Як даехала дадому? Ці ў парадку ўсё застала? Як маюцца Лора і Ляля?

Цалую Вас моцна.

Ваш *Адам.*

## № 103. Ганьне, Элеаноры і Алесі Бабарэкам

*7 красавіка 1935 г.*

Дарагія і любыя Анечка, Лорачка і Лялячка!

Пра Янку я ўжо пісаў Вам у лістоўцы. Ці атрымалі Вы? Ён атрымаў пашпарт у Бабруйску тэрмінам на тры месяцы.